ААВЛ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

***А.А. Корзюк***

# ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст. У АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЕ

Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем
вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай
адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў
вышэйшых навучальных устаноў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях:
1-020101 Гісторыя; 1-020102 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць

Мінск 2010

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № УК 4721

Репозиторий БГПУ

**СМЕРЦЬ ПАЛКОЎНІКА (1832 г.)**

На палянцы зялёнай, між думных бароў,
Дзе пад клёнам хацінка старая,
Бы застыў у зняменні атрад ваяроў:
Іхні там камандзір памірае.
Людзі з вёсак збіраюцца тут, ля варот.
Ён, палкоўнік, быў слаўны, няйначай,
Раз яму спагадае так прості народ,
Пра яго ўсё пытае ды плача.
Вось палкоўнік каня асядлаць загадаў
І прывесці бліжэй, да парога.
Перад смерцю яшчэ раз хоць глянуць жадаў
Ён на друга свайго баявога.
Загадаў свой прынесці паходны мундзір,
Свой кінжал, зброю, пояс стралецкі.
Ён хацеў і з рыштункам сваім, камандзір,
Развітацца, як колісь Чарнецкі*.
А калі ўжо ад хаты каня адвялі,
Ксёндз туды ўвайшоў з панам Богам.
Людзі з вёсак маліцца хутчэй пачалі,
Ціха ўкленчыўшы перад парогам.
Спалатнеўшы паўстанцы стаялі ў дзвярах.
Нават воі Касцюшкі былыя,
Што прайшлі ўсе агні, агрубелі ў баях,
Слёз сваіх не хавалі, сівыя.
Раным-рана ў капліцы званіць пачалі.
Ды хаваць камандзіра жаўнеры
Не змаглі: наляцелі якраз маскалі...
У капліцы для ўсіх – насцеж дзверы.
Там ляжаў ён на лаве – у спакоі чало,
У руках яго крыж, збоч нягнуткі
Нож-кінжал і ружжо, ва ўзгалоўі сядло.
Люд дзівіўся: такі маладзюткі!
Ды чаму твар дзявочы ў байца? Два грудкі...
Хто ж мог знаць, што баеў завадатар
Быў... дзяўчынай! Была – слёз не трэба, жанкі –
То ліцвінка Эмілія Плятэр! [4]

*Адам Міцкевіч.*

---

* Стэфан Чарнецкі (1599–1665) – славуты военачальнік Рэчы Паспалітай. Памёр у час баявога паходу ў вясковай хаце. Перад смерцю папрасіў прывесці ў хату свайго баявога каня з усім вайсковым рыштункам і сардэчна з ім развітаўся.



Вывучэнне палітычнага становішча ў Беларусі ў 1830–1840-х гг. і змен у палітыцы царызму пасля падаўлення паўстання, якое будзе разглядацца на наступным уроку, непасрэдным чынам узаемазвязана з паражэннем і вынікамі паўстання.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Цвірка К. Паданне пра філаматаў // Полымя. 1994. № 5.
2. Кісялёў Г. Падзорная труба Э. Плятэр // Спадчына. 1992. № 5.
3. Чаропка В. Легенда паўстання. Эмілія Плятэр (1806–1831) // Настаўніцкая газета. 2003. 13 верас.
4. Міцкевіч А. Смерць палкоўніка // Народная газета. 1995. 5 студз.


## 4.4. Тэма «Адукацыя і навука ў першай палове XIX ст.»

Магчымы два варыянты арганізацыі ўрока. Пры першым варыянце ўрок з'яўляецца камбінаваным: у яго першай частцы праводзіцца праверка ведаў вучняў па папярэднім параграфе «Прамысловасць, гандаль, гарады і мястэчкі Беларусі ў першай палове XIX ст.». Прапануем настаўнікам тэкст з прапушчанымі данымі, якія можна выкарыстаць пры праверцы засваення школьнікамі зместу вучэбнага матэрыялу па гэтай тэме:

*У канцы XVIII – першай палове XIX ст. у Беларусі існавалі прамысловыя прадпрыемствы чатырох тыпаў. Прадпрыемствы ў гаспадарцы памешчыка, дзе выкарыстоўвалася бясплатная працоўная сіла прыгонных сялян, называліся ………… **(вотчыннымі)**. Гарадская прамысловасць адчувала недахоп капіталаў, а таму была прадстаўлена ………… **(ручной)** вытворчасцю. Да прадпрыемстваў рамеснага тыпу адносяць ………… **(майстэрні)**, дзе гаспадар-майстар працаваў адзін або выкарыстоўваў працу ………… **(падмайстраў)** і ………… **(вучняў)**. У першай палове XIX ст. гарадскія рамеснікі яшчэ ўваходзілі ў адпаведныя прафесійныя аб'яднанні, якія называліся ………… **(цэхі)**.*

*На аснове рамяства ўзнікла дробнакапіталістычная вытворчасць, да якога адносяць прадпрыемствы з колькасцю рабочых ад*



Репозиторий БГПУ